**«І кружыцца планета Куляшова»**

**Тэхналагічная карта ўрока па беларускай мове ў 6класе**

**Т. П. Дзіндзікава,**

настаўніца гімназіі № 4 г. Магілёва

**Тэма:** Займеннік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Разрады займеннікаў па значэнні.

**Мэты:**

**навучальная:** да канца ўрока вучні **павінны ведаць** асаблівасці займенніка як часціны мовы, яго марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю ў сказе, функцыю ў маўленні ;

**развіццёвая:** павінны **ўмець** знаходзіць і ўжываць займеннікі ў тэксце, вызначаць іх пачатковую форму, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную функцыю, разрад па значэнні; рабіць самаацэнку сваіх пісьмовых і вусных вучэбных дасягненняў;

**выхаваўчая:** выхоўваць у дзяцей пачуццё гонару і павагі да роднага слова, да літаратурнай спадчыны **праз выкарыстанне матэрыялу пра А.Куляшова і творы пісьменніка**; спрыяць развіццю цікавасці да беларускай мовы як прадмета, стварыць на занятках атмасферу ўзаемапавагі ў калектыве, заахвочваючы імкненне дзяцей да ўзаемадапамогі.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу.

**Тэхналогія** прадуктыўнага навучання.

**Абсталяванне:** Красней, В.П., Лаўрэль, Я.М., Рачэўскі, С.Р. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 –га кл. агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання / В.П.Красней, Я.М.Лаўрэль, С.Р.Рачэўскі. – Мінск: НІА, 2009; апорны матэрыял, наглядны матэрыял па тэме ( прэзентацыя «Займеннік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Разрады займеннікаў па значэнні», слайды з матэрыялам пра А.Куляшова, тэставыя заданні, можна электронныя, напрыклад My Text), бланкі для выканання заданняў «Практычныя заданні», дадаткі 1, 2, 3, 4, 5; тэхнічнае (мультымедыйны праектар), камп’ютар (камп’ютары, калі выконваецца электронны тэст).

**Заўвага:** асаблівасцю прадуктыўнай тэхналогіі з'яўляецца тое, што гэта тэхналогія навучання рэалізуецца праз алгарытм, які ўключае сем этапаў ( і на кожным этапе настаўнік можа выкарыстоўваць розныя формы, метады дзейнасці ў залежнасці ад мэт, узроўню і здольнасцей вучняў):

1. **Прапедэўтычная практыка.** Тлумачальны слоўнік дае наступнае азначэнне гэтаму тэрміну: прапедэўтычны – уводны курс якіх-небудзь ведаў, курс, які ўяўляе сабой кароткі, элементарны змест гэтых ведаў. На гэтым этапе настаўнік арганізоўвае выкананне дыягнастычнага задання, якое дазваляе ўбачыць валоданне папярэднім матэрыялам і падрыхтаванасць да ўспрыняцця новых ведаў. Арганізоўвае карэкцыю.
2. **Арыентацыя.** Настаўнік тлумачыць мэту, вызначае аб'ём і структуру работы, характарызуе змест урока, сувязь яго з вывучаным матэрыялам, інфарміруе, як будзе вывучацца новы матэрыял, як будуць ацэньвацца вынікі. Высвятляе і ацэньвае сфарміраванасць у вучняў арыенціровачнай асновы дзейнасці.
3. **Прэзентацыя.** Прэзентацыя—на гэтым этапе тлумачыцца вучэбны матэрыял, дэманструюцца адказы, прыводзяцца прыклады, здзяйсняецца дыягностыка ведання і разумення вучэбнага матэрыялу. Пры неабходнасці настаўнік арганізоўвае карэкцыю ведаў.
4. **Практыка на прыкладах.** Ля дошкі або лепш на экране з мультымедыйным праектарам разбіраюцца прыклады выканання заданняў. Арганізоўваецца выкананне заданняў у групах, тройках, парах вучняў.
5. **Практыка, якой кіруюць.** Настаўнік арганізоўвае самастойнае выкананне заданняў вучнямі. Абыходзіць увесь клас, дапамагае, кансульціруе, правярае.
6. **Незалежная практыка ў класе.** Выкананне практыкаванняў адбываецца без дапамогі настаўніка. Настаўнік кансульціруе тых вучняў, якія не справіліся на папярэднім этапе.
7. **Дамашняя самастойная практыка.** Настаўнік вызначае аб'ём і складанасць дамашняй самастойнай працы.

## Ход урока

**Арганізацыйны момант** (2-3 хвіліны ).

**Мэта:** псіхалагічна настроіць вучняў на дзейнасць.

**Задача:** стварэнне добразычлівай рабочай атмасферы; наладжванне кантакту з

аўдыторыяй.




Гучыць музыка, спачатку гучна, потым цішэй (Э.Наско. Вакальная музыка «Рамансы на вершы А.Куляшова» або мелодыя «Алеся» (на верш А.Куляшова «Бывай» , музыка І.Лучанка).

| **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|
| 1. Вітаецца з вучнямі, выказвае спадзяванне на ўзаемападтрымку на ўроку.<br>2. Чытае радкі з верша Пімена Панчанкі «Куляшову», тлумачыць, што А.Куляшоў – наш зямляк, юбіляр гэтага года. На ўроку будзе магчымасць дакрануцца да спадчыны пісьменніка, бо ў якасці практычнага матэрыялу выкарыстоўваюцца ўрыўкі з вершаў паэта, выказванні пра пісьменніка.<br>3. Задае пытанне: «Якая навучальная ўстанова ў нашым горадзе носіць імя А.Куляшова?» | Слухаюць, успрымаюць словы настаўніка, настройваюцца на ўзаемадзеянне.<br><br>Адказваюць: Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова. |

<u>**1.Прапедэўтычная практыка** ( 5 хвілін).</u>

**Мэта:** псіхалагічная і пазнаваўчая гатоўнасць вучняў да атрымання новых ведаў.

**Задачы:** арганізаваць уваходную дыягностыку, убачыць валоданне папярэднім матэрыялам, падрыхтаваць да ўспрыняцця новых ведаў.

| **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|
| **1. Арганізуе франтальнае апытванне з мэтай паўтарэння тэарэтычнага матэрыялу:**<br><br>*а) які раздзел мовазнаўства вывучаем?*<br><br>*б) што сабою ўяўляе гэты раздзел?*<br><br>в) *дайце азначэнне паняцця «часціны мовы»?*<br><br>г) *колькі існуе часцін мовы?*<br><br>д) *на якія групы падзяляюцца часціны мовы?*<br><br>е) *колькі самастойных часцін мовы? Пералічыце іх.*<br><br>ж) *чаму іх называюць самастойнымі?*<br><br>з) *з якімі самастойнымі часцінамі мовы мы пазнаёміліся ў 6-ым класе?* | **1**. Адказваюць на пастаўленыя пытанні:<br><br>*а) марфалогія;*<br><br>*б) марфалогія –гэта раздзел мовазнаўства (навука аб мове), у якім словы вывучаюцца як часціны мовы;*<br><br>*в) часціны мовы – гэта такія разрады слоў, якія характарызуюцца пэўнымі агульнымі лексічнымі значэннямі, марфалагічнымі прыметамі і сінтаксічнымі функцыямі;*<br><br>*г) дзесяць;*<br><br>*д) самастойныя, службовыя і выклічнік;*<br><br>*е) шэсць—назоўнік, прыметнік, лічэбнік, дзеяслоў, займеннік, прыслоўе;*<br><br>*ж) маюць самастойнае лексічнае значэнне, адказваюць на пэўныя пытанні, маюць марфалагічныя прыметы, выконваюць пэўную сінтаксічную функцыю;*<br><br>*з) з назоўнікам, прыметнікам, лічэбнікам.* |
| **2. Арганізуе аналітычную работу з тэкстам** (дадатак 1).<br><br>**Аналітычная гутарка:**<br><br>✓ *Зачытайце паэтычныя радкі, захоўваючы арфаэпічныя* | **2.** Зачытваюць тэкст ( па адной страфе), адказваюць на пастаўленыя пытанні.<br><br>Магчымыя адказы вучняў на пастаўленыя пытанні пры аналітычнай гутарцы:<br><br>✓ *Да самастойных—адказваюць на* |

| | |
|---|---|
| *нормы, вызначце, да якіх часцін мовы , самастойных ці службовых, і чаму адносяцца выдзеленыя словы?*<br>✓ *Выдзеленыя словы называюць канкрэтныя прадметы, прыметы ці толькі ўказваюць на іх?*<br>(**Заўвага:** настаўнік тлумачыць, што пад паняццем «вы» пісьменнік мае на ўвазе сваіх былых паплечнікаў, аднадумцаў, таварышаў маладосці).<br>✓ *Да якіх самастойных часцін мовы падобныя выдзеленыя словы?*<br>✓ *Ці ведаеце, якія гэта самастойныя часціны мовы?*<br>✓ *Чаму такая назва гэтай часціны мовы?*<br>✓ *Такім чынам, над якой самастойнай часцінай мовы пачынаем працаваць?* | *пытанні (хто, што, які, чый, з'яўляюцца членамі сказа).*<br>✓ *Указваюць.*<br>✓ *Да назоўнікаў, прыметнікаў.*<br>✓ *Займеннікі.*<br>✓ *Замяняюць іншыя словы з папярэдніх сказаў…*<br>✓ *Займеннікам* |




**<u>2. Арыентацыя</u>** <u>(8-9 хвілін).</u>

**Мэта:** матывацыя на вучэбную дзейнасць.

**Задача:** высвятлянне і ацэньванне сфарміраванасці ў вучняў ведаў і навыкаў па папярэднім матэрыяле; стварэнне ўмоў для разумення мэты, зместу, структуры ўрока; арыентаванне на самаацэнку дзейнасці.

| Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў |
|---|---|
| • **Настаўнік тлумачыць мэту, вызначае аб'ём і структуру работы, характарызуе змест урока, сувязь яго з вывучаным матэрыялам, інфарміруе, як будзе вывучацца новы матэрыял, як будуць ацэньвацца вынікі:** *«такім чынам, мы працягваем з вамі працу па раздзеле «марфалогія», мэта нашага ўрока – асэнсаваць асаблівасці займенніка як часціны мовы; арыентую вас, што вы самі будзеце сябе ацэньваць па наступных пытаннях (дадатак 5), працаваць на лістках з дыдактычным матэрыялам,* ***і ўвесь матэрыял, з якім мы будзем працаваць на ўроку , сказы, тэксты, -- гэта творы нашага земляка, Аркадзя Куляшова, юбіляра гэтага года –*** *(настаўнік зачытвае матэрыял пра пісьменніка – кароткія біяграфічныя звесткі, радкі, якія выражаюць эстэтычнае крэда паэта, матэрыял пра зборнік вершаў «Маналог», з якога будуць выкарыстаны вершы на ўроку, арыентуе вучняў на асэнсаванне асобы пісьменніка з мэтай стварэння ўласных выказванняў пра асобу пісьменніка)* | Вучні слухаюць, успрымаюць зрокава і на слых інфармацыю, звяртаюць увагу на крытэрыі для самаацэнкі дзейнасці на ўроку ( дадатак 5) |







| Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў |
|---|---|
| | |

| | |
|---|---|
| • **Лексічная хвілінка:** тлумачэнне значэння слова «маналог».<br>• Настаўнік акрэслівае праблемнае пытанне : **аб чым маналог Аркадзя Куляшова?**<br>(Арыентацыя вучняў на адказ у канцы ўрока)<br>• Арганізуе працу з тэкстам: знайсці займеннікі і вызначыць іх разрад (вучні ведаюць з малодшай школы асабовыя займеннікі), сінтаксічную функцыю і назваць пачатковую форму.<br>*Стаю і з пачуццём неўтаймаваным*<br>*Гляджу на след блакітны за кармой,*<br>*Як быццам я плыву не акіянам,*<br>*А Бесяддзю – жаданаю ракой.*<br>*Плыву па ёй! Як хлопчыку малому,*<br>*Паслаў мне лёс блакітную раку –*<br>*Праз цёмны акіян яна дадому*<br>*Мяне вядзе , як маці, за руку.*<br>*…………………………………………………*<br>*(«Стаю і з пачуццём неўтаймаваным*<br>*Гляджу на след блакітны за кармой…» 1962 )*<br>• **Арфаграфічная хвілінка** (на паўтарэнне : растлумачыць падкрэсленыя арфаграмы).<br>• **Заўвага для цікаўных:** 'неўтаймаваны'– такі, якога цяжка, немагчыма ўтаймаваць, стрымаць, сцішыць.// Надзвычайны ў сваім праяўленні, вельмі моцны.<br>• **Самастойная праца** з тэарэтычным матэрыялам падручніка на с. 179, с.180 з мэтай удакладнення , паглыблення ведаў пра займеннік.<br><br>• **Робім вывад** пра займеннік як самастойную часціну мовы (на аснове ведаў з малодшай школы, уласных назіранняў, матэрыялу правіла ў | Выказваюць сваё разуменне значэння слова «маналог», параўноўваюць з азначэннем са слоўніка.<br><br><br><br>Зачытваюць верш, знаходзяць займеннікі (яны ўсе асабовыя), называюць іх пачатковую форму, вызначаюць сінтаксічную функцыю.<br><br><br><br>Тлумачаць арфаграмы (на паўтарэнне).<br><br><br>Вучні самастойна перачытваюць правілы на старонках 179, 180 .<br><br>**Прагназуемыя вывады:**<br><br>займеннік – гэта самастойная часціна мовы, якая указвае на прадметы, прыметы, колькасць, але не называе іх;<br><br>пачатковая форма займенніка – форма назоўнага склону адзіночнага ліку;<br><br>займеннік **сябе** не мае |

| | |
|---|---|
| падручніку на старонках 179, 180):<br>1) займеннік абазначае ці ўказвае на прадмет, прымету, колькасць?<br><br>2) якая пачатковая форма для займенніка?<br><br>3) што можаце сказаць пра займеннік ***сябе***?<br>4) якую сінтаксічную функцыю можа выконваць займеннік?<br>5) як вы думаеце, ці толькі існуюць асабовыя займеннікі ? | назоўнага склону;<br><br>займеннік можа быць як галоўным, так і даданым членам сказа;<br><br>існуюць, акрамя асабовых, займеннікі іншых разрадаў |










**3-4.Прэзентацыя + практыка на прыкладах** (5-8 хвілін).

**Мэта:** азнаямленне вучняў з разрадамі займеннікаў.

**Задача:** арганізаваць пазнаваўчую дзейнасць вучняў, дыягностыку ведання і разумення вучэбнага матэрыялу, карэкцыю ведаў.

<table>
<tr><th>Дзейнасць настаўніка</th><th>Дзейнасць вучняў</th></tr>
<tr><td>Азнаямленне з новай інфармацыяй.<br><br>1. Прэзентацыя тэмы «Разрады займеннікаў» (у вучняў – памятка, дадатак 3).<br><br>Арганізацыя практычнай дзейнасці.<br><br>2. Зачытайце ўслых паэтычныя радкі А.Куляшова, захоўваючы арфаэпічныя нормы, знайдзіце займеннікі, вызначце іх разрад па значэнні, назавіце пачатковую форму</td><td>1. Знаёмяцца з матэрыялам «Разрады займеннікаў» (памятка-дадатак 3).<br><br>2. Вучні зачытваюць урыўкі з вершаў, захоўваючы арфаэпічныя нормы, знаходзяць займеннікі, вызначаюць іх разрад і пачатковую форму.<br>1. Я (асаб.)—вязень твой (прынал.), а ты (асаб.)– мая (прынал.)турма,<br>Асуджан я (асаб.) любоўю пажыццёва.<br>Зняволенне маё (прынал.) датэрмінова<br>Ты (асаб.) скараціць спяшаешся дарма. («Да паэзіі»)<br>2. Дзе б я (асаб.) ні быў, дзе б мне (асаб.) ні давялося<br>Убачыць дол сівы ад палыну,<br>Пякуча сэрца сціснецца, і лёс я (асаб.)<br>Загінуўшых без вестак памяну. («Маналог»)<br>3.Мне ( асаб.) нечым (неазнач.) перад вамі (асаб.) ганарыцца,<br>Сябры!.. Адны ў нас (асаб.) пушчы і палі,<br>Засмаглымі радкамі з іх (прынал.) крыніц мы (асаб.)<br>Адзін і той (указ.) жа халадок пілі. («Так, мы – сябры па сэрцу і па зброі»)<br>4. ...Хай згублены сляды іх (прынал.) захавання,<br>Не страчаны іх (прынал.) сувязі з зямлёй.<br>…………………………………………….<br>Яна (асаб.) для іх (асаб.)– не вечны супакой,<br>А месца пасмяротнага спаткання,<br>Прызначанага ў памяці маёй (прынал.).<br>Пакуль жыву, яны (асаб.) жывуць са мной (асаб.).<br>(«Адзін памёр ад тыфусу брушнога…»)</td></tr>
</table>







**<u>Фізкультхвілінка</u>**, можна пад пэўную мелодыю (2 хвіліны).

Усе ўсталі, усміхнуліся,

Тут налева павярнуліся, і направа азірнуліся.

І яшчэ так два разы.

Кожны вучань рукі ў бокі

І пусціўся тут жа ў скокі.

Хопіць нам усім плясаць,

Трэба далей працаваць.

**<u>5.Практыка, якой кіруюць</u>** <u>(5 хвілін).</u>

**Мэта:** выпрацоўка навыкаў па вучэбным матэрыяле.

**Задача:** арганізаваць самастойнае выкананне заданняў вучнямі, узаемаправерку, карэкцыю ведаў.

| **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|
| Арганізуе самастойную працу: уставіць прапушчаныя арфаграмы, вызначыць разрад займеннікаў, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю, пачатковую форму для кожнага займенніка, ужытага ў тэксце (дадатак 2). | Вучні самастойна выконваюць заданне -- устаўляюць прапушчаныя арфаграмы, вызначаюць разрад займеннікаў, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю, вусна называюць потым пачатковую форму для кожнага займенніка, ужытага ў тэксце, абменьваюцца лісткамі з |

| | |
|---|---|
| Абыходзіць клас, дапамагае, кансульціруе, правярае. **Заўвага:** можна прапанаваць выконваць па варыянтах, у залежнасці ад колькасці строф – па 2 страфы на варыянт | практыкаваннямі і правяраюць адзін у аднаго, даюць кансультацыю, просяць дапамогі, калі трэба, у настаўніка; потым зачытваюць і каменціруюць |

**6.Незалежная практыка ў класе** (8 хвілін).

**Мэта:** праверыць узровень засваення вучэбнага матэрыялу.

**Задача:** стварыць умовы для выканання дыягнастычнай тэставай работы.

| **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|
| **1.** Арганізуе самастойнае выкананне вучнямі дыягнастычнага тэставага задання (дадатак 4), кансульціруе тых вучняў, у якіх узніклі цяжкасці на папярэднім этапе.<br><br>**2.** Арганізуе самаправерку.<br><br>**3.** Прапануе вучням працягнуць думку адным сказам, ужываючы займеннікі і адказваючы на праблемнае пытанне :»**Аб чым маналог Аркадзя Куляшова?»** Слухае выказванні вучняў, выпраўляе недахопы ў маўленні, падкрэслівае правільныя і найбольш змястоўныя выказванні | Вучні самастойна выконваюць дыягнастычнае тэставае заданне, правяраюць і ацэньваюць сябе самі (кожнае заданне –1 бал):<br><br>Адказы:<br><br>1.-3); 2.-Лічэбнік. 3.—Сем.<br><br>4. – Азначэнне. 5.—Прыналежны.<br><br><br>Магчымыя адказы. *Маналог Аркадзя Куляшова – гэта… «маналог **нашага** земляка аб **сваім** жыцці і аб лёсе **іншых** пісьменнікаў»; …усхваляваны маналог пра **тых** людзей, **якія** ва ўпартым змаганні з **усякімі** варожымі абставінамі застаюцца непераможнымі духоўна; …паэтычны маналог мастака слова, патрыёта з **кожным** суайчыннікам і нашчадкам **сваім**; …жывая памяць пра гераічнае мінулае **нашага** народа».* |

**7.Дамашняя самастойная практыка** (2 хвіліны).

**Мэта:** выкананне творчай работы.

**Задача:** акцэнтаванне ўвагі на неабходнасці паўтарэння і засваення тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў па ўжыванні займеннікаў у маўленні.

| **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|
| Прапануе вучням уважліва пераасэнсаваць тэарэтычны матэрыял падручніка , параграф №49, матэрыял памяткі-дадатка 3; стварыць міні-выказванне , выкарыстоўваючы займеннікі, на тэму «Наш зямляк – Аркадзь Куляшоў» | Вучні слухаюць, запісваюць дамашняе заданне |

**Рэфлексія** (2-3 хвіліны).

**Дзейнасць настаўніка:** прапануе вучням праставіць балы за кожны крытэрый (дадатак 5), выстаўленне адзнак на аснове гэтых балаў (сярэдні бал праастаўляецца вучням, якія жадаюць, астатнія дапрацуюць на наступным уроку).

**Дзейнасць вучняў:** самастойна прастаўляюць балы, паказваючы маніторынг ведаў па наступных пытаннях (дадатак 5).

**Дзейнасць настаўніка** (задае пытанні, слухае, аналізуе):

- ✓ **Якія складанасці ўзніклі? Чаму?**
- ✓ **За які крытэрый паставілі самы нізкі бал?**
- ✓ **Над чым трэба папрацаваць?**

**Заключнае слова настаўніка:** Такім чынам, на дадзеным уроку ўся праца была накіравана не толькі на асэнсаванне асаблівасцей займенніка як самастойнай часціны мовы і адпрацоўку навыкаў па дадзенай тэме, але і на асабістыя вашы якасці – на выхаванне пачуцця павагі і цікавасці да літаратурнай спадчыны Бацькаўшчыны, да творчасці А.А.Куляшова, да свайго роднага слова.

**Практычныя заданні**

**Дадатак 1**

Глядзіце без дакору і пагарды

**Вы** на **мяне** з экранаў **вашых** кніг,

Як кінастужак спыненыя кадры,

Гатовыя крануцца **кожны** міг.

На старце **вы**. Ад быстрае пагоні

**Мне** не ўцячы, а **вам** не перагнаць

**Мае** маршчыны і сівыя скроні,

**Якім** рукой да фінішу падаць.

Для **тых**, **хто вас** не бачыў, **вы** –

партрэты

Адстартаваўшых год. А для **мяне** –

**Вы** назаўжды **майго** юнацтва леты,

**Што** не падставяць скроні сівізне.

Для **іншых вы** – ахвяры радавыя

Крутых гадоў, бязлітасных судоў.

А для **мяне** – **вы** маршалы, **якія**

Камандавалі б арміямі слоў.

**(А.Куляшоў. «Глядзіце без дакору і пагарды…»)**

<u>**Дадатак 2**</u>

**Устаўце прапушчаныя арфаграмы, вызначце разрад займеннікаў, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю, пачатковую форму для кожнага займенніка, ужытага ў тэксце.**

Мой маналог, як палымя(н, нн)ы конь,

Пачуўшы подых бур, стрыжэ вушамі,

Спяшаецца, паразмаўляўшы з вамі,

Ад вечнага агню ў жыцця агонь.

Між намі лёс правёў размежаванне:

Вы – скрыжаванне рук, я – крокаў рух.

Аднак саюз мужчын…кі – не каханне,

Дзе трэ(ц, цц)і лішні пакідае двух.

Наш бра(т,ц)кі вузел не парве, я знаю,

Ні адгрымеўшы, ні наступны бой.

Я, ваша памяць, вас не пакідаю,

Бяру з сабой, як клятву, як набой.

Злучыліся: з дарогамі дарога,

З лістамі дрэва, са слязою пыл,

І ў сэрцы тым, дзе ўсёй зямлі трывога,

У тры разы прыбавілася сіл.

**(«Мой маналог, як палымяны конь…», 1964—1965 гг.)**

**<u>Дадатак 3. Памятка. Разрады займеннікаў</u>**

1. **Асабовыя:** я, мы, ты, вы, ён, яна, яно, яны.
2. **Зваротны:** сябе.
3. **Прыналежныя:** мой, наш, твой, ваш, яго, яе, ягоны, іх, іхні, іхнія, свой.
4. **Указальныя:** гэты, той, такі, гэтакі, столькі, гэтулькі.
5. **Азначальныя:** сам, самы, увесь (уся, усё), усякі, кожны, іншы, усе.
6. **Пытальныя:** хто? што? які? чый? каторы? колькі?
7. **Адносныя:** хто, што, які, чый, каторы, колькі .

8. **Адмоўныя:** ніхто, нішто, нічый, ніякі, ніколькі.
9. **Неазначальныя (няпэўныя):** нехта, нешта, некаторы, нейкі, нечы, некалькі, хтосьці, штосьці, якісьці, чыйсьці, хто-небудзь, што-небудзь, які-небудзь, чый-небудзь, абы-хто, абы-што, абы-які, абы-чый.

**Дадатак 4. Дыягнастычная тэставая работа (адказы – словы ў пачатковай форме).**

**1. Выберыце правільнае азначэнне:**

*1) займеннік – гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае прадмет, прымету, колькасць;*

*2) займеннік – гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае прадмет, прымету, колькасць, не называючы іх;*

*3) займеннік – гэта самастойная часціна мовы, якая ўказвае на прадметы, прыметы прадметаў, колькасць, не называючы іх;*

**2. Працягніце адказ: займеннік ужываецца замест наступных часцін мовы: назоўнікаў, прыметнікаў і … .**

**3. Колькі займеннікаў у дадзенай страфе ( у назве верша не ўлічваць):**

*Гадзіннік мой –не сонца, што ў зеніце,*

*Гадзіннік мой – не сэрца, што ў грудзях.*

*Сваім дакладным часам на арбіце*

*Сама зямля мой вымярае шлях… («Гадзіннік мой –не сонца, што ў зеніце…»)*

**4. Якую сінтаксічную функцыю выконвае ўказальны займеннік у сказе:**

*Хай сэрца стане, сонца ў хмарах згіне,*

*А ты,Зямля, няспынным крокам кроч,*

*Не дай на той мне ўпасці палавіне,*

*Дзе дня не будзе, будзе толькі ноч. («Гадзіннік мой –не сонца, што ў зеніце…»)*

**5. Вызначце разрад выдзеленага займенніка:**

*Ратуй людзей з бяды ліхой,*

*<u>іх</u> душы*

*На гвалт і на адчай не пакідай,*

*Ты радасць ім нясі, сабе –адчай,*

*Ім – волю, гвалт – сабе, ты духам дужы…*

*(«Варшаўскі шлях»)*

**<u>Дадатак 5</u>. Дыягностыка ведаў і ўменняў**

| № | Матэрыял | Бал (1—10) |
|---|---|---|
| **1.** | **Тэорыя—фармуляваць азначэнне паняцця «займеннік»** | |
| **2.** | **Уменне знаходзіць займеннікі ў сказах, вызначаць іх пачатковую форму** | |
| **3.** | **Уменне правільна вызначаць марфалагічныя прыметы, сінтаксічную функцыю займеннікаў** | |
| **4.** | **Уменне правільна вызначаць разрад займеннікаў па значэнні** | |
| **5.** | **Уменне ўжываць займеннікі ва ўласным маўленні** | |